# Чаму варта адмовіцца ад гарбаты ў пакеціках?

**Адмова ад традыцыйнай гарбаты ў пакеціках стала адным з новых экатрэндаў. Вакол гэтага прадмета заўсёды было шмат шуму: лічыцца, што ў такія мяшэчкі фасуюць самую нізкапробную сыравіну.**

**На самай справе можна знайсці гарбату рознай якасці - ад трэцяга гатунку да вышэйшага.**

**Але галоўная праблема — не ў змесціве, а ў самім пакеціку. Што ж з ім не так?**

**Гарбата… з пластыкам**

Паводле вынікаў даследавання апублікаванага амерыканскім хіміч ным таварыствам ASC, заварванне аднаго пластыкавага пакеціка з гарбатай пры тэмпературы 95 °C вызваляе прыкладна 11,6 млрд часціцмікрапластыку і 3,1 млрд часціц нанапластыку — полі-этыленфталату І нейлону — ў кубак з напоем. Атрымліва-ецца, што з кубкам гарбаты ў наш арганізм трапляе прыкладна 16 мкг палімераў. І хоць уплыў мікрапластыку ў доўгачасовай перспектыве недастаткова вывучаны, яго ўжыванне ад назначна не рэкамендуецца.

**Як чайныя пакецікі ўплываюць на экалагічную сітуацыю**

У складзе папяровых чайных па-кецікаў ёсць поліпрапілен (PP ці 05) — пластыкавы герметык. Ён не дае раз-макаць паперы ў гарачай вадзе, але з-за сумесі матэрыялаў такія пакецікі нельга перапрацаваць. А нейлонавыя пірамідкі могуць заставацца ў першапачатковым выглядзе дзясяткі гадоў у любым асяроддзі. Ацаніць маштаб праблемы ўтылізацыі можна на прыкладзе Вялікабрытаніі — адной з самых чайных краін Еўропы. Яе жыхары штодня выпіваюць больш за 150 млн кубкаў гарбаты, звыш 90 % — з пакецікаў, што ў перакладзе на пластыкавае смецце складае каля 150 тон у год.

**Папяровыя і нейлонавыя**

Нейлонавыя пірамідкі ў гарачай вадзе вылучаюць не толькі мікрапластык, але і таксіны. Аказваецца, што і «бяс-печныя» папяровыя пакецікі ўтрымліваюць пестыцыд эпіхлоргідрын, які пры награванні становіцца больш актыўным, уплывав на імунную і рэпрадуктыўную сістэмы і ўяўляе сабой канцэраген.

Папяровыя пакецікі складаюцца з драўняных валокнаў максімум на 75 % з невялікім даданнем валокнаў расліны абака, а астатняе — тэрмапластычнае валакно (каля 20 %). Менавіта дзякуючы яму пакецік не размакае ў кіпені, як звычайная сурвэтка.

**Ці ёсць альтэрнатыва**

Самы відавочны спосаб адмовы ад чайнага пакеціка на карысць здароўя і прыроды — выкарыстоўваць заварачны чайнік. Традыцыйны спосаб заваркі — гарантыя высокай якасці напою і бяспекі. Калі патрабуецца парцыённая заварка або вяртанне да чайніка здаецца вам нязручным, паспрабуйце шматразовыя прыстасаванні для заварвання гарбаты ў кубку.

**Што можна зрабіць?**

Калі выбраць прыдатны шматра-зовы гаджэт для заварвання рассыпной гарбаты ў кубку або аднавіць традыцыю заварвання гарбаты ў чайніку на ўсю сям’ю, чаяванне стане больш утульным і экалагічным. Купляйце гарбату на вагу — тэта лепшы спосаб ацаніць якасць чайнага ліста.